# ВЫНІКОВАЕ АБАГУЛЬНЕННЕ

## Працуем з паняццямі

**1.** Размяркуйце прапанаваныя гістарычныя факты па графах табліцы. Растлумачце свой выбар.

*«Амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, аперацыя «Баграціён», Белавежскія пагадненні, Брэсцкая мірная дамова, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, генацыд, глабалізацыя, дзяржаўны суверэнітэт, індустрыялізацыя, інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, «каляровыя рэвалюцыі», метад сацыялістычнага рэалізму, Мюнхенская дамова, нацыянальная самасвядомасць, неакаланіялізм, НТР, перабудова, рэферэндум, сталыпінская аграрная рэформа, сусветны эканамічны крызіс, утварэнне СНД, шматпалярны свет.*

| Гістарычная падзея | Гістарычная з'ява | Гістарычны працэс |
|---|---|---|
| | | |

**2.** Дапоўніце табліцу гістарычнымі фактамі з гісторыі Беларусі XIX — першай чвэрці XXI ст.

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**3.** З Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2024 г.)

...*палітычная бяспека* — стан абароненасці палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь ад унутраных і знешніх пагроз, які забяспечвае рэалізацыю незалежнай дзяржаўнай палітыкі, гарманічнае развіццё грамадства і дзяржавы, захаванне традыцыйных асноватворных каштоўнасцей беларускага народа, прытрымліванне канстытуцыйных правоў і свабод асобы;

*эканамічная бяспека* — стан абароненасці галін і сфер эканомікі ад уздзеяння пагроз, якія перашкаджаюць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю Рэспублікі Беларусь;

*інфармацыйная бяспека* — стан абароненасці інфармацыйнай прасторы, інфармацыйнай інфраструктуры і інфармацыйных рэсурсаў ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы;

*ваенная бяспека* — стан абароненасці нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь ад ваенных пагроз існуючых, і тых, што зараджаюцца;

*электаральны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь* — неад'емнае і выключнае права дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары, рэферэндумы ў мэтах забеспячэння рэалізацыі паўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару пры вяршэнстве Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і нацыянальнага заканадаўства, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс.

Выкарыстоўваючы засвоеныя веды і дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце табліцу, адлюстраваўшы ў ёй палітычная, эканамічныя і ваенныя выклікі (праблемы), з якімі сутыкнулася Рэспубліка Беларусь у першай чвэрці XXI ст., і адказы (рашэнні) беларускай дзяржавы на іх.

## Сістэматызуем веды

**4.** Выкарыстоўваючы стужкі часу, змешчаныя ў пачатку кожнага раздзела, і інфармацыю, якая змяшчаецца ў параграфах вучэбнага дапаможніка, выканайце наступныя заданні.

А. Назавіце асноўныя тэндэнцыі сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага і духоўнага развіцця Беларусі ў згаданыя перыяды. Даныя запішыце ў табліцу.

| Перыяд | Асноўныя тэндэнцыі |
|---|---|
| **XIX — пачатак XX ст.** | |
| **1917–1945 гг.** | |
| **Другая палова 1940-х — пачатак 1990-х гг.** | |
| **Канец XX — першая чвэрць XXI ст.** | |

Б. Ахарактарызуйце асноўныя змены ў адной са сфер жыцця грамадства — сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай, духоўнай, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў XIX — першай чвэрці XXI ст.

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**5.** Паразважайце над наступнымі праблемнымі пытаннямі і заданнямі.

А. Расійскі гісторык В. В. Ключэўскі лічыў, што гісторыя не вучыць людзей наўпрост, а хутчэй карае за няведанне ўрокаў мінулага. Што такое ўрокі гісторыі (мінулага)? Якія ўрокі мусіць здабыць сучаснае грамадства з гісторыі XIX — першай чвэрці XXI ст.?

Б. «Народ, які не ведае сваёй гісторыі, не мае будучыні» (М. В. Ламаносаў). Чаму важна захоўваць гістарычную памяць народа? Якія падзеі XX — першай чвэрці XXI ст. павінен памятаць кожны беларус?

В. Як вы разумееце сцвярджэнне: «Каштоўнасці сучаснага беларускага грамадства гістарычна абумоўлены»? Ці згодны вы з ім? Канкрэтызуйце сваю думку прыкладамі.

**6.** Напішыце эсэ на тэму «Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што берагчы» ў дачыненні да вывучанага ў 11 класе перыяду гісторыі.